# ХТО, КАЛІ НЕ МЫ?

## Самакіраванне пачынаецца з упарадкавання навакольнага свету

Тыповы пад'езд шматпавярховіка — тэрыторыя хаосу, якую імкнешся як мага хутчэй праскочыць, каб апынуцца ва ўтульным і ўпарадкаваным свеце сваёй кватэры. Бо абшарпаныя сцены, аблезлы лінолеум і жмуты правадоў колюць вочы сваёй першабытнай неўпарадкаванасцю. Вядома, у непрыгожым таксама ёсць свая эстэтыка. Нездарма карыстаюцца папулярнасцю постапакаліптычныя фільмы, дзеянне якіх адбываецца на руінах цывілізацыі. Але адна справа — кіно, і зусім іншая — рэальнае жыццё, у якім хочацца цешыцца парадкам і чысцінёй.



Пад'езд можа быць такі...

Але часам падаецца, што прасцей саматугам запусціць ракету на Марс, чым зладзіць збор сродкаў на рамонт пад'езда. «А ў мяне грошай няма», «Мне і так добра», «Няхай ЖЭУ само рамантуе — мы за камуналку і так многа плацім» — падобныя адгаворкі чуеш ад кожнага другога. Цяпер, праўда, камунальнікі маюць законнае права самастойна пачаць рамонт непрывабнага пад'езда і пасля спаганяць за гэта грошы з жыльцоў, якім застаецца толькі абурацца «свавольству» ЖЭУ і наракаць, што сцены не ў той колер пафарбавалі. Але хто перашкаджаў самім заняцца рамонтам? Бо даўно вядома: хочаш, каб было зроблена добра, — зрабі сам.

У слушнасці гэтага выслоўя я пераканаўся на ўласным досведзе. Вярнуўшыся аднойчы з працы, заўважыў, што ўваход у пад'езд блішчыць свежай фарбай. Пафарбавана была і лесвічная клетка першага паверха разам з паштовымі скрынямі. А на сцяне нехта нават намаляваў матылькоў. Немудрагеліста, амаль па-дзіцячы, але ў выніку з'явілася хоць нейкая эстэтыка. Таямніца неспадзяванага цуду раскрылася неўзабаве: на дзвярах пад'езда з'явілася абвестка з прапановай паўдзельнічаць у рамонце лесвічнай клеткі першага паверха, здаўшы ўсяго рубель у адну з кватэр.

Не ведаю, як іншыя жыльцы, а я рубель здаў. Бо было, шчыра кажучы, сорамна за ўласную безыніцыятыўнасць. Заадно і пагутарыў з жанчынай, якая навяла красу ў пад'ездзе. Высветлілася, што разам з суседкай яны купілі фарбу, узялі пэндзлікі і за дзень справіліся з хаосам, што панаваў на лесвічнай клетцы гадамі.

Іх ніхто аб гэтым не прасіў, ніхто за гэта не плаціў. У адказ на маю прапанову напісаць пра іх у газету кабета замахала рукамі. Маўляў, не трэба ёй гэткай «паблісіці». Дый рабілі для сябе, а не для славы. Не чакаючы, пакуль да нашага пад'езда нарэшце дойдуць рукі ў камунальнікаў.

Так, мы плацім за камунальнае абслугоўванне. І штогод усё болей. Але не варта ўсе праблемы спісваць на ЖЭУ. Бо бачыў дзясяткі прыкладаў, калі зробленае камунальнікамі добраўпарадкаванне менш чым за паўгода зводзілася на нішто. Свежапафарбаваныя сцены пакрываліся брыдкімі надпісамі, лямпачкі разбіваліся, а на пабеленай столі з'яўляліся сляды сажы: нехта не ленаваўся рэгулярна падсмальваць яе запальнічкай. І вось цікавае назіранне: часцей за ўсё такое адбываецца ў пад'ездах старых дамоў, дзе кватэры раней выдаваліся бясплатна. Цяпер яны, праўда, спрэс прыватызаваныя, але не па рынкавым кошце, а фактычна за капейкі... Затое ў пад'ездах новых дамоў, дзе кватэры прадаваліся па камерцыйных цэнах, дзе квадратныя метры людзі набывалі за свае кроўныя, пануе некранутая чысціня. Бо як ні круці, а прыватнаўласніцкія пачуцці найлепш матывуюць да захавання парадку на сваёй тэрыторыі. Ты разумееш, што адваліў вялізныя грошы не толькі за ўтульную кватэру, але і за лесвічную пляцоўку, і за ліфт, і за іншыя месцы агульнага карыстання. І ты першым зловіш за вуха малалетняга падшыванца, што надумаў адлюстраваць на сцяне свой багаты слоўнікавы запас. Ты першым пагоніш выпівохаў, што туляюцца па пад'ездах і пакідаюць пасля сябе адходы жыццядзейнасці. І ты сам прыбярэш за сабой, калі раптам насмеціў у ліфце або на пляцоўцы. Бо пачуваеш сябе гаспадаром.



...А можа быць і такі.

І нам, беларусам, часта бракуе адчування такой гаспадарлівасці. Зона нашай маральнай адказнасці за чысціню і парадак абмяжоўваецца хатай або кватэрай. Усё астатняе — не наша справа. Мы можам месяцамі наракаць на поцемкі ў пад'ездзе і лаяць ЖЭУ, але самі і пальцам не варухнём, каб купіць капеечную лямпачку і паставіць замест сапсаванай. Ці ўзяць малаток і пару цвікоў ды падправіць лавачку ў двары. Ці зрабіць заўвагу кампаніі, што сядзіць з бутэлькай на дзіцячай пляцоўцы. Ці хоць бы проста выклікаць міліцыю, калі асцерагаешся атрымаць у мызу ад нецвярозага боўдзіла. А між іншым, менавіта з гэтага і пачынаецца мясцовае самакіраванне, пра якое мы так многа пішам на старонках «МС». Калі пачынаеш кіраваць тым, што знаходзіцца ў тваім абсягу. Гэта не патрабуе вялікіх намаганняў, але ў той жа час дапамагае зрабіць жыццё крыху лепшым і больш камфортным.

> Нам, беларусам, часта бракуе адчування такой гаспадарлівасці. Зона нашай маральнай адказнасці за чысціню і парадак абмяжоўваецца хатай або кватэрай.

Чаму мы жывём на сваёй зямлі не як гаспадары, а як прышлыя? Як часовыя пасяленцы з адпаведнай псіхалогіяй? Адбыць сваё на працы, забегчы ў краму і хутчэй заскочыць у сваю ўтульную «норку»... Адсюль і вынікаюць многія праблемы, з якімі сутыкаецца наша краіна. Бо мы ахвотна жалімся на тое, як цяжка жыць і як усё навокал кепска. Але нават не спрабуем зрабіць хоць нешта, каб хаосу стала крыху менш, а ўтульнасці і ўпарадкаванасці — больш.

**Валянцін БОЙКА.**
*boika@zviazda.by*

А НЕ ШКОДЗЬ!

# НЕЛЕГАЛЫ ЗБІРАЛІ ЧАРАМШУ НА ПРАДАЖ

**Чарамша, або мядзведжая цыбуля, — расліна, уключаная ў Чырвоную кнігу Беларусі. У выніку антрапагеннага ўздзеяння месцаў, прыдатных для яе росту, у краіне няшмат. І кожную вясну дзяржінспектарам даводзіцца затрымліваць там нелегальных зборшчыкаў. Пучкі чырванакніжнай чарамшы яны нарыхтоўваюць для продажу.**

— У гэтым годзе з-за пацяплення чарамша вырасла амаль на месяц раней. «Не драмалі» і нелегалы: толькі за тры дні ў Асіповіцкім раёне дзяржінспектары затрымалі дзесяць жыхароў райцэнтра, кожны з іх у сярэднім сабраў каля кілаграма мядзведжай цыбулі, — расказалі ў Дзяржінспекцыі. — Куды больш паспелі нарыхтаваць двое жыхароў Стоўбцаў на тэрыторыі Уздзенскага лясніцтва — кожны нарваў па 9 кілаграмаў чырванакніжнікаў. Чарамшу адразу фасавалі па пучках, каб на электрычцы адправіць гандляваць ёю ў Мінск.

Цяпер зборшчыкам прыйдзецца пакрыць нанесеную навакольнаму асяроддзю шкоду ў памеры 5 (за лісце) або 7 (за цыбуліны) базавых велічынь за адзін кілаграм чарамшы. Акрамя таго, ім будзе прызначаны штраф — ад 20 да 50 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Открытое акционерное общество
**«Трикотажторг»**
**220005, г. Минск, ул. Платонова, 30**
УНП 100185103 ОКЭД 46421 ОКОНХ 71130 ОКПО 015698255000

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
на 31 декабря 2016 года *(тыс. руб.)*

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2016 г. | На 31 декабря 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | 110 | 1 081 | 1 151 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 62 | 61 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **1 143** | **1 212** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 644 | 652 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 39 | 40 |
| готовая продукция и товары | 214 | 605 | 612 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 5 | 8 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 7 | 12 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 670 | 828 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 993 | 804 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **2 319** | **2 304** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **3 462** | **3 516** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31 декабря 2016 г.** | **На 31 декабря 2015 г.** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 113 | 113 |
| Резервный капитал | 440 | 13 | 48 |
| Добавочный капитал | 450 | 1 050 | 1 050 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 911 | 902 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **2 087** | **2 113** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | - | - |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 1 375 | 1 403 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 1 336 | 1 360 |
| по авансам полученным | 632 | 6 | 3 |
| по налогам и сборам | 633 | 2 | 11 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 5 | 3 |
| по оплате труда | 635 | 23 | 23 |
| прочим кредиторам | 638 | 3 | 3 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **1 375** | **1 403** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **3 462** | **3 516** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
с 1 января по 31 декабря 2016 *(тыс. руб.)*

| Наименование показателей | Код строки | За 2016 г. | За 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 6 572 | 6 952 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (5448) | (5669) |
| Валовая прибыль | 030 | 1 124 | 1 283 |
| Управленческие расходы | 040 | (398) | (391) |
| Расходы на реализацию | 050 | (783) | (772) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | (57) | 120 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 150 | 110 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (205) | (215) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | (112) | 15 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 71 | 110 |
| в том числе: проценты к получению | 103 | 71 | 110 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 198 | 269 |
| в т.ч.: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 198 | 269 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (131) | (69) |
| в т.ч.: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (131) | (69) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 138 | 310 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 26 | 325 |
| Налог на прибыль | 160 | (13) | (73) |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (3) | (11) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 10 | 241 |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 10 | 241 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | 0,13 | 3,20 |
| Примечание: отсутствующие сроки имеют нулевые значения | | | |

**Информация о деятельности ОАО «Трикотажторг»**
4. Доля государства в уставном фонде эмитента: 31,26%

| Вид собственности | Кол-во акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| коммунальная | 23596 | 31,26 |
| в том числе городская | 23596 | 31,26 |

**5-6. Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Ед. измер. | С начала года | За анал. период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 24 | 24 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 2 | 2 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | - | - |
| в том числе: физических лиц | лиц | 22 | 22 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | - | - |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 1,35 | 34,85 |
| Фактически выплаченные дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 34,85 | 17,52 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | руб. | 0,0178 | 0,461738 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | руб. | 0,461738 | 0,232145 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | год | за 2015 | х |
| Дата принятия решения о выплате дивидендов | число, месяц, год | 24 марта 2016 | х |
| Срок выплаты дивидендов | число, месяц, год | 5 апреля 2016 | х |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | руб. | 27,65 | 28,00 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | 0 | 0 |
| 8. Среднесписочная численность работающих | чел. | 95 | 101 |

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: оптовая торговля – 73%, розничная торговля – 23%.
10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 28 марта 2017 года.
13. Сведения о применении эмитентом правил корпоротивного поведения: свод правил рассмотрен на наблюдательном совете общества и используется при разработке локальных правовых нормативных актов.
14. Адрес официального сайта ОАО «Трикотажторг» в глобальной комьютерной сети Интернет: trikotag.by

**Аудиторское мнение аудитора – индивидуального предпринимателя Афанасьевой Людмилы Сергеевны по бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Трикотажторг» за 2016 год**

По моему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Трикотажторг» достоверно во всех существенных аспектах отражает его финансовое положение, финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения (движение денежных средств) за 2016 год в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности.

Аудитор – индивидуальный предприниматель Афанасьева Л.С.
Генеральный директор И.Э. Кобза
Главный бухгалтер О.Ф. Величко